Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Грыцкавіцкі навучальна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – сярэдняя школа”

# Лес – наша багацце

канспект  гутаркі ў 1 рознаўзроставай групе

Грышчанка Наталія Вікенцьеўна
вышэйшая адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

Праграмныя задачы: фарміраваць уяўленні дзяцей пра лес, пра ўзаемасувязь леса і чалавека, раслін і жывёл, іх харчовай залежнасці адзін ад аднаго; развіваць пазнаваўчы інтарэс; выхоўваць у дзяцей цікавасць, дапытлівасць, беражлівыя адносіны да лесу і яго насельнікаў.

Матэрыял: ілюстрацыі і карціны пра лес, дрэвы, кветкі, Лесавік, касцюм сарокі.

Папярэдняя праца: дзіцячыя малюнкі пра лес, вырабы з прыроднага матэрыялу, прагулкі ў лес, збор палявых кветак.

Ход гутаркі

Выхавальнік: Сябры! у гэты сонечны і цёплы дзень мы сабраліся на свята, толькі дзеці паглядзіце хто да нас ляціць. Што гэта за птушка, дзеці? - Сарока! Так, дзеці гэта сарака, і яна нам прынесла тэлеграму, давайце яе прачытаем: “Тэлеграма ад старога Лесавіка. Ён нас запрашае да сабе ў госці - у лес!”

Выхавальнік: вось дзякуй сарака-белабока, за запрашэнне, толькі мы дарогу ў царства лясное не ведаем.

Сарока: Я вас з задавальненнем праводжу, для гэтага вы павінны мне сказаць якія вы ведаеце прыказкі пра лес!

Лес і вада – родныя брат і сястра.

Высокае дрэва здалёку відаць.

Дзе мухаморы, там і баравікі.

Дзе ягаднік, там і ягада.

Няма лесу-пасадзі, мала лесу-беражы, шмат лесу-не губі!

Расліна-зямлі ўпрыгожванне.

Чым далей у лес, тым больш дроў.

Сарока-белабока: малайцы дзеці! Вы вельмі шмат прыказак ведаеце.

А скажыце мне, калі ласка для чаго нам патрэбен лес?

Адказы дзяцей:

Лес-гэта месца жыхарства птушак і жывёл.

Лес ахоўвае нас ад моцных і халодных вятроў.

Лес дае нам будаўнічы матэрыял.

Лес дае нам чыстую ваду і паветра.

Малайцы! Давайце зараз пойдзем у лес.

Насустрач дзецям ідзе Стары Лесавік.

“Добры дзень дзеці, а вы чулі, што ў нашым лясным царстве сёння будзе свята? У нашым царстве дзяржаве любяць дапытлівых і знаходлівых дзяцей.

Лесавік: Сябры! Вы не бойцеся мяне, я вас крыўдзіць не буду, я вельмі рады вам. Вось я задам вам загадкі, а вы адгадайце:

Летам апранаецца, зімой распранаецца. Што гэта такое? (Лес)

Не звер, не птушка. Нос як спіца.

Ляціць-пішчыць, сядзе-маўчыць. (Камар).

Рук многа, а нага адна. (Дрэва.)

Сядзіць паненка, на ёй чырвоная сукенка, хто ідзе - ёй паклоніцца. (Суніца.)

Сем тысяч майстроў зрабілі хату без акон і без вуглоў. (Мурашкі, мурашнік.)

Вось рабяты малайцы, усе загадкі разгадалі, паглядзіце вакол як нас сустракае лес, птушачкі спяваюць. Давайце мы з вамі паслухаем гукі прыроды (праслухоўванне запісу з гукамі прыроды)

Ну як вам дзеткі гэтыя гукі, спадабаліся? Што вы зараз пачулі? Дзіцячыя адказы.

Зараз я Вам пакажу сваё царства лясное. Лес-гэта наша багацце! Тут вельмі шмат дрэў. (Рагзглядванне малюнкаў дрэў)

Лесавік: госці мае дарагія, паглядзіце вакол: якая прыгожая паляна кветак, назавіце, калі ласка, назвы кветак, пацешце дзеда!

У лужку-лужочку
выраслі сястрычкі:
Залатое вочка, белыя расні́чкі. (Рамонкі.)
Узімку цыбулінка спіць-спачывае.
Прачнецца – і кветкі наволю пускае.
Хай снег, хай мароз – у вясновым падлеску
Красуюць блакітныя кветкі – пралескі.
У сабачай старой будкі
Распусціліся незабудкі.
Наш пухнаты рыжы пес
У незабудкі тыкае нос:
“Колькі жыць на свеце буду –
Незабудкі не забуду!”
Сінія званочкі, сінія званкі,
Стаялі сасмяглыя, сонныя.
Мы іх збіралі, ставілі ў збанкі,
Паілі вадой сцюдзёнаю.
Мы іх хавалі ў цень ля сцяны,
Ставілі на падаконнікі
І верылі, што ад шчасця яны
Зазвоняць тоненька-тоненька.
Яны ж на луг пазіралі з акна —
і ніводзін нават не дзвынкнуў.
І была ў сінім сэрцы кожнага званка
Белая-белая слязінка...

Адказы дзяцей: рамонак, незабудкі, званочак, пралеска.

Лесавік: Давайце, пагуляем-адпачнем.

Фізкультмінутка

Мы да лясной палянцы выйшлі,
Падымаем ногі вышэй,
Праз кусцікі і купіны,
Праз галінкі і пянечкі,
Вельмі доўга мы ішлі.
Нашы ножанькі стаміліся.
Зараз сядзем адпачнем
І зноў пойдзем гуляць!

Лесавік: Ой ды якія малайцы нашы дзеткі! Давайце пагуляем у гульню “У мядзведзя ў бары”

У мядзведзя ва боры
Грыбы, ягады бяру.
А мядзведзь не спіць,
Усё на нас глядзіць.
А потым зарыкае,
І за намі пабяжыць.

Лесавік: Ай-ай-ай, я на нешта наступіў, нага баліць паглядзіце калі ласка. Ах, гэта асколак ад шкла. Дзеткі адкуль узяўся гэты асколак.

Выхавальнік: хлопцы давайце дапаможам Лесавіку, забінтуем ножку.

А вы дзеці ведаеце, як правільна сябе паводзіць у лесе: што можна, а чаго нельга рабіць у лесе?

Паказ папераджальных знакаў “Правілы паводзін дзяцей у лесе”

Нельга ламаць дрэвы і кусты.
Нельга шумець у лесе.
Нельга разбураць мурашнікі.
Не таптаць грыбы.
Не распальваць вогнішча.
Не пакідаць смецце.

Лесавік: а цяпер дзеці каму спадабалася ў нас, вазьміце сабе рамонкі, а каму хочацца яшчэ раз прыйсці ў лес,  возьміце ландышы, толькі памятайце, што ландышы ў нас знаходзяцца ў Чырвонай кнізе. А што вы ведаеце пра Чырвоную кнігу. Што гэта за кніга? І чаму яна чырвонага колеру? Адказы дзяцей

Нашы дзеці проста малайцы, яны ўсё ведаюць пра наша царства лясное. Давайце разам любіць, ахоўваць прыроду.

Да пабачэння, рабяты!